82.3(4Бел)
И23

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ
І ФАЛЬКЛОРУ імя К.КРАПІВЫ

УДК 882.6.09-192 (043.3) + 398.8/476 (043.3)

Івахненка
Таццяна Анатольеўна

# ПАЭТЫКА БЕЛАРУСКІХ АБРАДАВЫХ ПЕСЕНЬ ПЕРЫЯДАЎ КАЛЯНДАРНЫХ ПЕРАХОДАЎ: СЕМАНТЫКА. ВОБРАЗНЫ ЛАД. КАМПАЗІЦЫЯ

10.01.09 – фалькларыстыка

Аўтарэферат дысертацыі
на прысуджэнне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Віцебскі дзяржаўны
універсітэт
імя П.М. Машэрава
БІБЛІЯТЭКА

Мінск 2001

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

*20504133*

Работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Навуковы кіраўнік: кандыдат філалагічных навук, дацэнт Кавалёва Р.М.

Афіцыйныя апаненты:

доктар філалагічных навук, прафесар Ненадавец А.М.
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Лозка А.Ю.

Апаніруючая арганізацыя – Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны

Абарона адбудзецца 22 сакавіка 2001 года ў 11 гадзін на пасяджэнні савета Д 01.42.01 па абароне дысертацый на прысуджэнне вучонай ступені доктара навук пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К.Крапівы НАН Белару[illegible]72, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, к. 2, п. 302. Тэлефон вучонага сакратара 28[illegible]

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы ім. Я.Коласа НАН Беларусі.

Аўтарэферат разасланы “20” лютага 2001 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат гістарычных навук В.М.Бялявіна

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

## Актуальнасць тэмы дысертацыі

Праблемы генезісу і эвалюцыі катэгорый паэтыкі неаднаразова разглядаліся як тэарэтыкамі літаратуры, так і фалькларыстамі, аднак да сённяшняга дня існуе шэраг нявырашаных пытанняў, звязаных з асаблівасцямі станаўлення славеснай парадыгмы, вобразнага ладу і кампазіцыйнай парадыгмы. Названая акалічнасць робіць мэтазгодным пошук вырашэння праблемы праз зварот да старажытнейшых жанраў фальклору – напрыклад, да каляндарна-абрадавай паэзіі і, у прыватнасці, да масленічных, траецкіх, куставых і русальных песень, паэтыка якіх, у параўнанні з іншымі аграрна-песеннымі жанрамі, характарызуецца адноснай стабільнасцю развіцця, своеасаблівай закансерваванасцю, захаванасцю старажытных семантычных, структурных і функцыянальных канстантаў.

Вывучэнне станаўлення славеснай і кампазіцыйнай парадыгм паэтыкі, а таксама вобразанага ладу на матэрыяле беларускіх абрадавых песень перыядаў каляндарных пераходаў робіць магчымым параўнанне атрыманых вынікаў з ужо існуючымі канцэпцыямі і дазваляе праверыць гіпотэзу аб шматвектарным развіцці сродкаў паэтычнага мастацтва.

## Сувязь работы з навуковымі праграмамі і тэмамі

Дысертацыйная работа з'яўляецца спецыяльным даследаваннем па паэтыцы абрадавай песні ў сукупнасці яе славеснай, кампазіцыйнай парадыгм і вобразнага ладу. Яна цесна звязана з уключанымі ў дзяржаўны план навуковымі тэмамі кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта – "Тэарэтычныя праблемы развіцця беларускага пісьменства і культуры" і "Усходнеславянская міжлітаратурная супольнасць XX стагоддзя".

## Мэты і задачы даследавання

Мэта дадзенай работы – на матэрыяле беларускіх абрадавых песень перыядаў каляндарных пераходаў выявіць стадыяльныя асаблівасці генезісу і эвалюцыі славеснай парадыгмы, вобразнага ладу і кампазіцыйнай парадыгмы паэтыкі.

Задачы:

– на ўзроўні песеннай тэматыкі, ідэалогіі, рытуалаў, вобразаў параўнаць масленічную і сёмушна-траецкую абраднасці беларусаў, аргументаваць неабходнасць іх аб'яднання ў асобныя перыяды каляндарных пераходаў;

– ахарактарызаваць семантыку паняцця "перыяд каляндарных пераходаў" (ці ПКП), яго карэляцыю з іншымі пераходнымі святамі і абрадамі каляндарнага года;

– на аснове комплекснага падыходу (з улікам гістарычных, лінгвістычных, археалагічных дадзеных) даказаць, што станаўленне і развіццё тропікі беларускіх абрадавых песень ПКП адбывалася ў залежнасці ад эвалюцыі свядомасці

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



старажытнага чалавека і было абумоўлена абрадава-рытуальнай неабходнасцю яе выкарыстання;

– ахарактарызаваць вобразныя сістэмы беларускіх абрадавых песень ПКП, аргументаваць неабходнасць увядзення асобага тэрміна – вобраз-"маска" – для ідэнтыфікацыі цэнтральных і "фонавых" дзейных асоб абрадавых тэкстаў;

– вылучыць і прааналізаваць сродкі стварэння вобразаў-"масак" у масленічных, траецкіх, куставых і русальных песнях з улікам спецыфікі адлюстравання рэчаіснасці старажытным чалавекам;

– на аснове выяўленых славесных формул рэканструяваць старажытна-першасныя схемы кампазіцыі масленічных, траецкіх, куставых і русальных песень;

– даказаць, што станаўленне кампазіцыйных форм абрадавых песень ПКП адбывалася ў накірунку ад маналогу і маналогу-звароту праз дыялог да аповеду; выявіць стадыяльныя асаблівасці станаўлення кампазіцыйных прыёмаў у тэкстах абрадавых песень ПКП.

## Аб'ект і прадмет даследавання

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца беларускія абрадавыя песні ПКП (масленічныя, траецкія, куставыя і русальныя). Іх значнасць праяўляецца ў тым, што, з'яўляючыся своеасаблівым адбіткам тых часоў, калі ў свядомасці чалавека ўладарыла вера ў душу ўсяго існага на зямлі і на небе, як структурныя формы на нейкім этапе свайго развіцця яны законсерваваліся, не рэалізаваўшы закладзеных у іх магчымасцей. Дзякуючы даволі моцнай спеўна-абрадавай традыцыі, яны захаваліся як запатрабаваныя адзінкі (зразумела, у часткова змененым выглядзе), што робіць магчымым іх выкарыстанне ў якасці фактычнага матэрыялу.

Прадметам даследавання з'яўляецца паэтыка, пад якой разумеецца сістэма сродкаў выражэння ў абрадавай песні ў кантэксце яе генезісу і эвалюцыі славеснай парадыгмы, вобразнага ладу і кампазіцыйнай парадыгмы.

## Гіпотэза

Адсутнасць у сістэме тропікі беларускіх абрадавых песень ПКП метафар дазваляе гаварыць пра шматвектарнае развіццё сродкаў паэтычнага мастацтва і прадставіць іх станаўленне як эвалюцыю ад больш простых (эпітэт, увасабленне, вобразны паралелізм) да больш складаных (параўнанне, сімволіка) у структурна-семантычным плане форм.

## Метадалогія і метады даследавання

У дысертацыі разгляд паэтыкі даследуемых песень абапіраецца на тэарэтычныя палажэнні прац вядомых даследчыкаў А.А.Патабні, А.М.Весялоўскага, Ф.І.Буслаева, Е.М.Мелятінскага, С.Ю.Няклюдава, М.К.Гея; выкарыстаны агульнатэарэтычныя работы па фалькларыстыцы і літаратуразнаўству Я.В.Анічкава, Б.М.Пуцілава, П.Г.Багатырова, В.І.Яромінай, Б.М.Тамашэўскага, В.М.Жырмунскага, Г.Н.Паспелава, А.Ф.Лосева, Ю.М.Лотмана, Н.С.Гілевіча, А.С.Фядосіка, К.П.Кабашнікава, А.С.Ліса, В.П.Рагойшы, М.А.Андрэева.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



Навуковую базу даследавання склалі песенныя тэксты, змешчаныя ў зборніках П.В.Шэйна "Белорусские народные песни" (1874), "Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края" (1887, Т. 1, ч. 1), Е.Р.Раманава "Белорусский сборник" (1912, вып. 8), "Песні народных свят і абрадаў" (1974) Н.С.Гілевіча, "Песни восточнославянской общности" (1977) В.І.Ялатава, "Веснавыя песні" (1979) са зводу БНТ, "Песні беларускага Паазер'я" (1981) З.Я.Мажэйка, "Вянок беларускіх народных песень"(1988) У.Раговіча, "Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць" (1985), "Беларускі фальклор у сучасных запісах: Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць" (1989), "Паэзія беларускага земляробчага календара" (1992), "З крыніц спрадвечных" (1997) У.М.Сысова, "Святы і абрады беларусаў" (1998) В.Д.Ліцьвінкі, архіўныя матэрыялы НДЛ БФ БДУ. Таксама выкарыстаны матэрыялы запісаў русальных песень, зробленых аўтарам пад час уласнай фальклорнай экспедыцыі (1993 г.), якія надрукаваны ў артыкуле "Ах, мая русалачка, летні ты цвяточак... Абрад "Провады русалкі" ў сучасным выяўленні" (Роднае слова. 1995. № 5. С. 123-130), а таксама ў "Метадычных указаннях і ілюстрацыйных матэрыялах да правядзення фальклорнай практыкі студэнтаў філалагічнага факультэта" (Вып. 2. Каляндарна-абрадавая паэзія Мн.: БДУ, 1997).

Работа абапіраецца на дасягненні вядомых замежных даследчыкаў Л.Леві-Бруля, В.Тэрнера, А. ван Геннепа, С.М.Бауры.

Гістарычная пераемнасць у развіцці духоўных з'яў традыцыйнай культуры – галоўная метадалагічная ўстаноўка даследавання. У рабоце акцэнт робіцца на дынаміцы паэтыкі ў часе, іншымі словамі, на дыяхронным аспекце вывучэння з выкарыстаннем параўнальна-гістарычнага і рэтраспектыўнага метадаў.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў**

Дысертацыя з'яўляецца першым у галіне гістарычнай паэтыкі комплексным даследаваннем стадыяльных асаблівасцей станаўлення сродкаў славеснай парадыгмы (тропаў), вобразастварэння і кампазіцыйнай (уласна кампазіцыйнай) будовы.

Упершыню масленічная і сёмушна-траецкая абраднасці разглядаюцца ў тыпалагічным плане, у сувязі з чым канкрэтызуецца існуючае ў навуцы паняцце "пераходнага перыяду" ў дачыненні да святаў і абрадаў каляндарнага года як тэрмін "перыяд каляндарных пераходаў", які ўпершыню апрабіруецца на беларускім матэрыяле.

Прапанавана канцэпцыя шматвектарнасці станаўлення сродкаў тропікі абрадавай песні; упершыню выяўлены, сістэматызаваны і абгрунтаваны першасныя сродкі вобразастварэння і старажытныя схемы кампазіцыі абрадавых песень.

**Практычная значнасць вынікаў**

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны: для далейшых навуковых распрацовак пры вырашэнні тэарэтычных праблем літаратуразнаўства і фалькларыстыкі ў галіне гістарычнай паэтыкі, у прыватнасці, пры вывучэнні

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


іншых жанравых груп каляндарна-абрадавых песень з боку станаўлення і развіцця іх паэтычнай семантыкі, сродкаў стварэння вобразаў, строфікі, славесных формул, кампазіцыйных прыёмаў; у педагагічнай рабоце: пры выкладанні лекцыйных курсаў і на практычных занятках па фальклору і літаратуразнаўству, у падрыхтоўцы спецкурсаў і спецсемінараў. Апублікаваныя вынікі дысертацыі могуць стаць асновай для напісання студэнтамі курсавых і дыпломных работ.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону**

Тыпалагічнае падабенства масленічнай і сёмушна-траецкай абраднасці як умова іх аб'яднання ў асобны перыяд каляндарных пераходаў.

Характарыстыка ўзроўню тропаў славеснай парадыгмы абрадавых песень ПКП: генезіс і эвалюцыя сродкаў паэтычнай семантыкі адбывалася ў накірунку ад больш простых да больш складаных у структурна-семантычным плане форм (ці ад эпітэта і ўвасаблення праз вобразны паралелізм да параўнання і сімволікі).

Увасабленне, розныя формы эпітэтаў (поўныя, кароткія, прыдаткі), прамыя апісанні – першасныя сродкі вобразастварэння абрадавай песні, існаванне якіх абумоўлена дзвюма групамі старажытных ўяўленняў, што характарызуюць усе вылучаныя вобразы-"маскі": уяўленні пра зрокава ўспрымаемы аб'ект і ўяўленні пра сутнасць аб'екта.

Прынцып паўтаральнасці як базавы прынцып пабудовы старажытных абрадавых тэкстаў, на якім заснаваны дзве стадыі станаўлення кампазіцыі абрадавай песні – "радок за радком" і ланцугападобнае спалучэнне радкоў. Генетычна яны ўзыходзяць да свайго "першапродка" – "далучальнай сувязі", характэрнай для пячорных малюнкаў палеалітычнай эпохі.

Прынцып нарошчвання прэдыкатыўнасці – неабходная ўмова існавання славесных формул, з дапамогай якіх магчыма узнаўленне старажытных кампазіцыйных схем абрадавых песень. Маналог (маналог-зварот), дыялог, аповед як эвалюцыйныя кампазіцыйныя формы выканання старажытных "народна-абрадавых гульняў" (па тэрміналогіі А.М.Весялоўскага).

Прынцып паралельнага размеркавання сінтаксічных канструкцый і прынцып паўтаральнасці – аснова ўзнікнення і функцыянавання кампазіцыйных прыёмаў абрадавых песень ПКП (з аднаго боку, сінтаксічнага паралелізму, з другога – розных відаў паўтораў (анафары, эпаналепсіса, канкатэнацыі, прыпеваў)).

**Асабісты ўклад саіскальніка**

У дысертацыйнай рабоце на аснове тыпалагічнага аналізу атрыманы навукова абгрунтаваныя крытэрыі, якія дазволілі аднесці масленічныя, траецкія, куставыя і русальныя песні да асобных перыядаў каляндарных пераходаў. Мэтазгоднасць выкарыстання ПКП пацвердзілася аналізам канкрэтнага матэрыялу, у выніку чаго:

– на ўзроўні славеснай парадыгмы паэтыкі аўтарам абгрунтаваны этапы станаўлення сімволікі ў яе карэляцыйных сувязях з абрадам, прапанавана канцэпцыя шматвектарнага развіцця сродкаў паэтычнай семантыкі;

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



– на ўзроўні вобразнага ладу даказана неабходнасць увядзення паняцця вобраз-“маска” ў дачыненні да дзейных асоб песенных тэкстаў, вылучаны першасныя сродкі вобразастварэння ў абрадавых песнях, прааналізаваны асацыятыўныя сувязі цэнтральных вобразаў-“масак” з кампанентамі прырода- і культураэлементаў, а таксама элементаў пераходнага характару;

– на ўзроўні кампазіцыйнай парадыгмы аргументавана станаўленне кампазіцыйных форм ад маналога да аповеду, выяўлены старажытныя кампазіцыйныя схемы масленічных, траецкіх, куставых і русальных песень.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі**

Матэрыялы дысертацыі разглядаліся на пасяджэннях кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта (пратаколы № 9 ад 25 чэрвеня 2000 г. і № 2 ад 18 кастрычніка 2000 г.). Прамежкавыя і канчатковыя вынікі даследавання былі апрабіраваны на працягу 1998-2000 гадоў на наступных навуковых канферэнцыях: “Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе: проблемы теоретической и исторической поэтики” (Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я Купалы, Гродна, 15-17 красавіка 1998 г. і 14-16 красавіка 1999 г.); “Мова – Літаратура – Культура” (Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск, 22-23 верасня 1998 г.); “IV Рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў РБ” (Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы, Гродна, 5-6 кастрычніка 1998 г.); “Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя” (Беларускі дзяржаўны універсітэт імя М.Танка, Мінск, 22-23 кастрычніка 19998 г.); “Современная филология: сегодня и завтра” (Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск, 30 красавіка 1999 г.); “Актуальныя праблемы беларускага літаратуразнаўства” (Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.Куляшова, Магілёў, 23-24 сакавіка 1999 г.); “Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай” (Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск, 12-14 кастрычніка 1999 г.), “Мастацкі вобраз: генезіс, станаўленне, сучасны стан” (Брэсцкі дзяржаўны універсітэт ім. А.С.Пушкіна, Брэст, 28-30 верасня 2000 г.), “Першыя шырмаўскія чытанні” (Беларускі дзяржаўны універсітэт, Мінск, 30 лістапада 2000 г.).

**Апублікаванасць вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання знайшлі адлюстраванне ў 9 публікацыях, сярод якіх 2 – навукова-тэарэтычныя артыкулы, 7 – матэрыялы навуковых канферэнцый. Агульная колькасць апублікаваных матэрыялаў складае 50 старонак.

**Структура дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння і трох дадаткаў (схемы, табліцы). Агульны аб’ём дысертацыі – 105 старонак. Бібліяграфія ўключае 149 назваў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


Абедзвюм разнавіднасцям вобразаў-"масак" характэрна ўжыванне аднолькавых сродкаў вобразастварэння, да якіх адносяцца ўвасабленне (персаніфікацыя (Доля)), розныя формы эпітэтаў (поўныя, кароткія, прыдаткі) і прамыя апісанні. Гэта абумоўлена наяўнасцю двух крытэрыяў, на якіх старажытныя творцы неўсвядомлена акцэнтавалі ўвагу пры вербальным узнаўленні вобразаў: уяўленні пра зрокава ўспрымаемы аб'ект і ўяўленні пра сутнасць аб'екта, прычым выкарыстанне эпітэтаў карэлюе з II-м відам уяўленняў, а ўвасабленне і прамыя апісанні – з II-м, што заканамерна: апісальнасць адпавядае спецыфіцы абрадавай паэзіі як адлюстраванню перш за ўсё руху абраду [3, 6].

5. Аналіз кампазіцыйнай парадыгмы абрадавых песень ПКП паказаў, што асноўным арганізуючым прынцыпам іх пабудовы з'яўляецца прынцып паўтаральнасці, на якім, у прыватнасці, заснаваны этапы эвалюцыі кампазіцыі абрадавай песні "радок за радком" (С.Баура) і ланцуговае спалучэнне радкоў (Б.М.Дабравольскі). Генетычна яны ўзыходзяць да свайго першапачатку – "далучальнай сувязі", выяўленай пры вывучэнні паслядоўнасці адлюстраванняў у пячорных малюнках эпохі палеаліту, знойдзеных у Сібіры, Іспаніі і Францыі [4].

6. Уласна кампазіцыю абрадавых песень ПКП складаюць слоўныя формулы, кампазіцыйныя формы і прыёмы, у аснове якіх ляжаць тры прынцыпы. Першы з іх – прынцып нарошчвання прэдыкатыўнасці – абумоўлівае існаванне славесных формул, з дапамогай якіх былі выяўлены наступныя старажытныя схемы кампазіцыі абрадавых песень: суб'ект праз інструментальныя адносіны ўплывае на аб'ект, суб'ект праз зварот да аб'екта ўздзейнічае на яго і суб'ект уплывае на аб'ект пэўнымі дзеяннямі, што характарызуе архаічную стадыю ў станаўленні грамадства, заснаваную на веры ў магію дзеяння і слова.

Станаўленне кампазіцыйных форм адбывалася ад маналога і маналога-звароту (I-я стадыя) праз дыялог (II-я стадыя) да аповеду (III-я стадыя), што цесна звязана з формамі выканання старажытных "песняў-гульняў" (ад хора да двух паўхораў і вылучэння асобы выканаўцы).

Кампазіцыйныя прыёмы грунтуюцца на двух прынцыпах: паралельнага размеркавання сінтаксічных канструкцый (сінтаксічны паралелізм) і паўтаральнасці (анафара, эпаналепсіс, канкатэнацыя, прыпеў). Станаўленне сінтаксічных паралелізмаў цесна звязана з развіццём кампазіцыйных форм (хоры), тады як станаўленне разнавіднасцей канкатэнацыі (паўтарэнне ў пачатку наступнага верша, з аднаго боку, усяго радка, з другога – спалучэнняў слоў) – са старажытнымі прынцыпамі арганізацыі абрадавых тэкстаў "радок за радком" і ланцуговым спалучэннем радкоў.

Прыпевы прайшлі ў сваім развіцці таксама тры эвалюцыйныя стадыі: па прапанаванай намі класіфікацыі, "асемантычныя" прыпевы (ці словы са страчанай семантыкай і эмацыянальныя воклічы) характарызуюць I-ю стадыю іх станаўлення, семантычныя (словы і сказы, якія валодаюць сэнсам і ў наш час) – II-ю, а наяўнасць адзінкавага тэксту, у якім выкарыстаны прыпевы і першай, і другой разнавіднасцей, указвае на III-ю, трансфармаваную стадыю іх развіцця [5].

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## Спіс апублікаваных работ па тэме дысертацыі

### Навуковыя артыкулы


1. Івахненка Т.А. Беларуская русальная абраднасць: праблемы вывучэння // Веснік БДУ. – Серыя 4. – Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – № 1. – 1999. – С. 14-17.

2. Івахненка Т.А. Генезіс сістэмы тропікі беларускіх абрадавых песень перыяду каляндарных пераходаў // Веснік БДУ. – Серыя 4. – Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – № 1. – 2000. – С. 13-18.


### Матэрыялы навуковых канферэнцый


3. Івахненка Т.А. З гісторыі вывучэння беларускай русальнай абраднасці // Беларускае Асветніцтва: вопыт тысячагоддзя: Зб. Матэрыялаў міжнароднага кангрэса, Мінск, 20-21 кастрычніка 1998 г. – У 2-х кнігах. – Кніга 2. / Рэдкал. У.А.Васілевіч, А.І.Лугоўскі і інш. – Мн.: БДПУ імя М.Танка, 1998. – С. 56-59.

4. Івахненка Т.А. Праблема сістэматызацыі тэкстаў беларускага русальнага фальклорна-этнаграфічнага комплексу // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе (проблемы теоретической и исторической поэтики): Материалы международной научной конференции (Гродно, 16-18 апреля 1998) / Под ред. Т.Е.Автухович. В 2 ч. – Ч. 1. – Гродно: ГрГУ., 1998 г. – С. 257-262.

5. Івахненка Т.А. Тыпалогія беларускіх абрадавых песень перыяду каляндарных пераходаў // Мова – Літаратура – Культура: Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, верасень 1998 г.). – Мн.: БДУ, г. – У 2-х ч. – Ч. 2. – С. 110-112.

6. Івахненка Т.А. Сродкі стварэння вобразаў-персанажаў Масленкі і Бярозы ў беларускіх абрадавых песнях перыяду каляндарных пераходаў // Современная филология: сегодня и завтра / Под ред. Гапоненко И.О., Леонович В.Л., Сурковой Е.С. – Мн.: БГУ, 1999. –С. 69-73.

7. Івахненка Т.А. Тропіка беларускіх абрадавых песень перыяду каляндарных пераходаў // Terra alba. Вып. 1.: Праблемы беларускага літаратуразнаўства: Зб. матэрыялаў навуковай канферэнцыі, Магілёў, 25-26 сакавіка 1999 г. – Магілёў, МДУ ім. А.Куляшова, 1999. – С. 337-344.

8. Івахненка Т.А. Абрад і сімвал: да пытання станаўлення тропа // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе (проблемы теоретической и исторической поэтики): Материалы международной научной конференции (Гродно, 15-17 апреля 1999 г.): В 2 ч. – Ч.2 / Под ред. Т.Е.Автухович. – Гродно: ГрГУ, 2000. – С. 128-135.

9. Івахненка Т.А. Эпітэт у сістэме тропікі беларускіх абрадавых песень перыяду каляндарных пераходаў // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: Матэрыялы 4 міжнароднай навуковай канферэнцыі. – У 2-х ч. – Ч. 2. – Мн.: БДУ, 2000. – С. 84-88.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## РЭЗЮМЭ

Івахненка Таццяна Анатольеўна

Паэтыка беларускіх абрадавых песень перыядаў каляндарных пераходаў: Семантыка. Вобразны лад. Кампазіцыя

Ключавыя словы: паэтыка, перыяды каляндарных пераходаў, тропіка, вобразны лад, вобраз-"маска", славесныя формулы, кампазіцыйныя схемы, формы і прыёмы.

Аб'ектам даследавання з'яўляюцца беларускія абрадавыя песні перыядаў каляндарных пераходаў (масленічныя, траецкія, куставыя і русальныя). Прадмет даследавання складае паэтыка, пад якой разумеецца сістэма сродкаў выражэння ў абрадавай песні ў кантэксце яе генезісу і эвалюцыі славеснай парадыгмы, вобразнага ладу і кампазіцыйнай парадыгмы.

Мэта дадзенай работы – на матэрыяле беларускіх абрадавых песень перыядаў каляндарных пераходаў выявіць стадыяльныя асаблівасці генезісу і эвалюцыі славеснай парадыгмы, вобразнага ладу і кампазіцыйнай парадыгмы паэтыкі.

У рабоце акцэнт робіцца на дынаміцы паэтыкі ў часе, ці на дыяхронным аспекце вывучэння з выкарыстаннем параўнальна-гістарычнага і рэтраспектыўнага метадаў. Дысертацыя з'яўляецца першым у галіне гістарычнай паэтыкі комплексным даследаваннем стадыяльных асаблівасцей станаўлення сродкаў славеснай парадыгмы (тропаў), вобразастварэння і ўласна кампазіцыйнай будовы. Упершыню атрыманы вывады, якія дазволілі канкрэтызаваць існуючае ў фалькларыстыцы паняцце "пераходнага перыяду" як тэрмін "перыяд каляндарных пераходаў", апрабацыя якога ўпершыню праводзіцца на беларускім матэрыяле, абаснаваць канцэпцыю шматвектарнасці станаўлення сродкаў тропікі абрадавай песні, выявіць, сістэматызаваць і абгрунтаваць першасныя сродкі вобразастварэння і старажытныя схемы кампазіцыі абрадавых песень.

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць выкарыстоўвацца ў навуковай і вучэбна-метадычнай рабоце ў галіне літаратуразнаўства і фалькларыстыкі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ




## РЕЗЮМЕ

Ивахненко Татьяна Анатольевна

Поэтика белорусских обрядовых песен периодов календарных переходов: Семантика. Образный строй. Композиция

Ключевые слова: поэтика, периоды календарных переходов, тропика, образный строй, "образ-маска", словесные формулы, композиционные схемы, формы и приемы.

Объектом исследования являются обрядовые песни периодов календарных переходов (масленичные, троицкие, кустовые, русальные). Предмет исследования составляет поэтика, под которой имеется в виду система средств выражения в обрядовой песне в контексте ее генезиса и эволюции словесной парадигмы, образного строя и композиционной парадигмы.

Цель данной работы – на материале белорусских обрядовых песен периодов календарных переходов выявить стадиальные особенности генезиса и эволюции словесной парадигмы, образного строя и композиционной парадигмы поэтики.

В работе акцентируется внимание на динамике поэтики во времени, или на диахронном аспекте изучения с использованием сравнительно-исторического и ретраспективного методов. Диссертация является первым в области исторической поэтики комплексным исследованием стадиальных особенностей становления средств словесной парадигмы (тропов), создания образов и собственно композиционного построения. Впервые получены выводы, которые позволили конкретизировать существующее в фольклористике понятие "переходного периода" как термин "период календарных переходов", апробация которого впервые проводится на белорусском материале, обосновать концепцию многовекторности становления средств тропики абрядовой песни, выявить, систематизировать и аргументировать первичные средства создания образов и древние схемы композиции обрядовых песен.

Материалы диссертационного исследования применимы в научной и учебно-метадической работе в области литературоведения и фольклористики.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**SUMMARY**

Ivakhnenka Tatsiana Anatolyevna

Poetics of belarusian ritual songs of seasonal transitions:
Semantics. System of images. Compositions

Key words: poetics, seasonal transitions, tropes, system of images, "mask"-image, verbal formuls, schems of composition, forms and devices.

The object of research is belarusian ritual songs of seasonal transitions (songs of Shrovetide, trinity songs, "bush"-ritual and rusalka songs). The subject of research is poetics as a system of expressional means in the ritual songs in the context of its genesis and evolution of verbal paradigm, system of images and a paradigm of composition.

The aim of the research is clarifying the stages and peculiarities of genesis and evolution of verbal paradigm, system of images and composition, paradigm of poetics in belarusian ritual songs of seasonal transitions.

The emphasize is made on the dynamics of poetics, that is diachronical aspect of study with usage comparative-historical and retrospective methods on analysis. The dissertation is the first complex investigation undertaken in the field of historical poetics that discovers the peculiarities of formational stages of tropes (verbal paradigms), images and construction of composition.

For the first time the conclusions which were made allow to assept into scientifical usage new conseption of "several ways" – formation of tropes in ritual songs, to reveal, systematize and substantiate the primary means of creation of images and ancient schems of composition of the ritual songs.

The materials of the dissertation can be used in teaching and for further scientific reseaches in the field of study of literature and folklore.

*20504133*

Подписано в печать 25.01.2001 г. Формат 60x84 1/32 Бумага офсетная
Усл.изд.л. 1,0 Заказ № 3/2 Тираж 100 экз.
ИПЭ 220072 г. Минск ул. Сурганова 1, корп. 2.
Произведено на оборудовании ПКП «ЮНИЛЭНД»
г. Минск ул. Жилуновича 15-605